





WARREN ELLIS • DARICK ROBERTSON • KIM DEMULDER
SUGGESTED FOR MATURE READERS
HELIX
DC COMICS
4 • DEC 97
$2.50 US
$3.50 CAN
★ ★ ★ ★ LATE EDITION ★ ★ ★ ★
TRANSMETROPOLITAN™
TRUST ME
КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
ТРАНСМЕТРАПАЛІТЭН #4
ПЕРАКЛАД:
АРТУР БАРАДАЧОЎ
АФАРМЛЕННЕ: COMICSBY
COMICSBY.BY
VK.COM/COMICS_BY
COMICSKRAMA.BY
VK.COM/COMICSKRAMA
DIRECT SALES





TRANSMETROPOLITAN 4. December, 1997. Published monthly by DC Comics, 1700 Broadway, New York, NY 10019. POSTMASTER: Send address changes to TRANSMETROPOLITAN, DC Comics Subscriptions, P.O. Box 0528, Baldwin, NY 11510. Annual subscription rate $30.00. Canadian subscribers must add $12.00 for postage and GST. GST # is R125921072. All foreign countries must add $12.00 for postage. U.S. funds only.
Printed in Canada.
DC Comics. A division of Warner Bros.–A Time Warner Entertainment Company



ЛАЙНО.
ПРЫНЯЦЬ ВЫКЛІК. А ПОТЫМ АДРУБІЦЬ ТЭЛЕФОННУЮ СУВЯЗЬ. КАБ У ДАЛЕЙШЫМ НЕ ПЕРАПЫНЯЛІ МАЕ ШЧЫРЫЯ ВЫКАЗВАННІ.
POTI
You have a call!
ДЗЕ МОЙ МАРКІТАВАНЫ СЛУПОК?
ВОСЬ РОЙС, ВОСЬ З'ЕШ ЛАЙНА І ЗДОХНІ. У МЯНЕ ЯШЧЭ ДВА ДНІ, САМ ЖА ВЕДАЕШ, ЛІСЦІМОН ТЫ І СКНАРА.
ДЫ ХОПІЦЬ ТАБЕ... ВАРТА БЫЛО **ПАСПРАБАВАЦЬ**. ЯК **КВАТЭРА**?
ЗУСІМ НЯДРЭННАЯ. КОШКА ТУТ ПАРАЧКУ ГЕКОНАЎ ПАДЛАВІЛА. ДРЭННА ТОЛЬКІ, ШТО ТРЭБА БЫЛО ЦЯГНУЦЬ З САБОЙ СТАРЫ ЗБІРАЛЬНІК.
У ЦЯБЕ ТАМ ДРУГІ ПАКОЙ НІХТО НЕ ЗАЙМАЎ? ТОЙ, ШТО З АСОБНАЙ ВАННАЙ?
НУ ЯК ШТО, ТРЭБА Ж ТВАЙМУ НОВАМУ АСІСТЭНТУ ДЗЕСЬЦІ СПАЦЬ.
ХІБА ТОЛЬКІ ПАД ЛОЖКАМ ГЕКОН АДШУКАЕЦЦА, А ТАК – НЕ, А ШТО?
А, НУ ТАК. ГЭТ' ЛЁГКА. ГЭТ' БЕЗ ПРАБЛЕМ...



ШТО ТЫ СКАЗАЎ?
ТАК, СЛУХАЙ: ТВОЙ СЛУПОК ПЯЧЭ, ЯК ПЯКЕЛЬНАЕ ПОЛЫМЯ ГРЭШНУЮ ДУПУ. ЗА ДВА ТЫДНІ ТЫРАЖ «ВОРД» ВЫРАС НА ТРЫЦЦАЦЬ ПЯЦЬ ПРАЦЭНТАЎ.
І КАЛІ ТЫ ВЫРАШЫЎ, ШТО Я ДАЗВОЛЮ ТАБЕ ЎЗЯЦЬ І ЎСЁ ПРАСРАЦЬ, ТО ТЫ ЯШЧЭ ДУРНЕЕ, ЧЫМ ЗДАЕШСЯ.
МЫ НАНЯЛІ ТАБЕ ПАМОЧНІЦУ, КАБ У ЦУГЛЯХ ЦЯБЕ ТРЫМАЛА. ЛІЧЫ, ШТО Я АБАРАНЯЮ СВАЕ ІНВЕСТЫЦЫІ.
ЯНА, НАПЭЎНА, ЎЖО ПАДНІМАЕЦЦА. БУДЗЬ ЦАЦАЙ.
ДЫ ЛЁГКА. ПАЧУЕМСЯ. АДБОЙ.
А ДЗЕ Ж МОЙ КІШКАРАЗДЗІРАЦЕЛЬ, ЯКІ Я ЎЧОРА КУПІЎ?
ВУНЬ ТАМ? ЛІЧЫШ?
НУ-С, ЯКІ РЭЖЫМ? ВАДКІ, БУРЛІВЫ...
...УРАГАННЫ.
POP


ГАВОРАЦЬ ВАШЫ ДЗВЕРЫ. У ВАС НАВЕДВАЛЬНІК.
...З'ЯВІЎСЯ...
АСІСТЭНТА ЁН МНЕ НА ШЫЮ ПАСАДЗІЦЬ, ТАК? ПЭТЛАХА Ў АКУЛЯРАХ ЁН НА МЯНЕ НАПУСЦІЦЬ, ТАК?
KISS HERE
НУ, Я ЯМУ ПАКА-ЖУ... Я ІМ УСІМ ПАКАЖУ...
ХА!



А Я ЦЯБЕ ВЕДАЮ.
ШЭНАН ЯРОЎ. РАНЕЙ ТРЫ НОЧЫ Ў ТЫДЗЕНЬ ТАНЧЫЛА Ў СТРЫП-КЛУБЕ НА КУЦЕ КРЭБЕРЫ І НІКСАН. ЗАРАБЛЯЛА НА ШКОЛУ ЖУРНАЛІСТЫКІ.
ГЭТА З ТАБОЙ МЫ НА ДАХУ СЯДЗЕЛІ?
РАЗНЯ Ў ЭЙНДЖАЛС-8. А ТЫ БЫЛА...
АДНОЙ СА СТРЫП-ТЫЗЁРАК. З ГЭТЫМ ВЫРАШЫЛІ. А ЗАРАЗ МЯНЕ НАНЯЛІ ТАБЕ Ў АСІСТЭНТЫ.
НУ, ДЫК Я МАГУ ЎВАЙСЦІ, ЦІ ТЫ СПАЧАТКУ ПА КІШКАХ МНЕ КУЛЬНЕШ?
ВЕДА-ЕШ, ШТО ГЭТА?
У ШКОЛЕ ТАКІ ЗБІРАЛА, НА ПРАЦОЎНЫМ НАВУЧАННІ.
POTI
ВЫДАТНА, ЗАПРАШАЮ.



ЛЮБА ТУТ...
ВУНЬ ТАМ БУДЗЕ ТВОЙ ПАКОЙ. ГЭТА КОШКА.
HOLO DECO
ЖУДАСНАЯ СКАЦІНА. ІМЯ Ў ЯЕ ЁСЦЬ?
ЯНА КУРЫЦЬ ЧОРНЫ РУСКІЯ ЦЫГАРКІ. САЧЫ, КАБ У НАС ЗАЎСЁДЫ БЫЎ ЗАПАС ХОЦЬ СОТНІ Ў ПАЎТАРЫ.
Я КУРУ «КАРЦЫНОМА ЭЙНДЖАЛС». САЧЫ, КАБ ЗАПАС БЫЎ СЕМ СОТНЯЎ. САМА КУРЫШ?
KISS HERE
НЕ.
ПАЧНІ. НАБОР АНТЫРАКАВАЙ ПРАФІЛАКТЫКІ ЗНОЙДЗЕШ У ВАННАЙ, КАЛІ ТОЛЬКІ ЯШЧЭ СІМПТОМЫ НЕ ЗАЎВАЖАЛА.
ТАК, ЗАРАЗ: НЕДАЛЁКА АДСЮЛЬ – АФРЫКАНСКАЯ ЗАБЯГАЛАЎКА. ВОЗЬМЕШ ДВА МАНКІБУРГЕРА, ПЕЧАНУЮ БУЛЬБЯНУЮ ЛУПІНУ І ВЯЛІКУЮ ШКЛЯНКУ МАТАКЕ.
ПАЧАКАЙ. ПАЧАКАЙ. АСІСТЭНТ – ТАК. НЯВОЛЬНІК СПАЙДАРА ЕРУСАЛІМА – НЕ.
ТЫ, ЯК ПАМЯТАЮ, ЖУРНАЛІСТАМ ЖАДАЛА СТАЦЬ?
ТАК.
ТАДЫ НЕ ПЕРАПЫНЯЙ.



ЯК ВЕРНЕШСЯ, МЫ З ТАБОЙ СЯДЗЕМ, І ЗА МАНКІБУРГЕРАМ ТЫ ПАВЕДАМІШ МНЕ ПРА ЎСЁ, ШТО БАЧЫЛА ПА ДАРОЗЕ НАЗАД.
НА ВОШТА ГЭТА?
А ДЛЯ ТАГО! НЯ БЫЦЬ ТАБЕ **САПРАЎДНЫМ** ЖУРНАЛІСТАМ, ПАКУЛЬ НЕ НАВУЧЫШСЯ **НАЗІРАЦЬ**.
НУ ЎСЁ, ТУПАЙ. ЧАКАЮ МАНКІБУРГЕР.
ТОЛЬКІ ПРОСЬБА.
НУ?
АПРАНІСЯ ДА МАЙГО ПРЫХОДУ, А? КАЛІ МНЕ ЗА ЕЖАЙ ДАВЯДЗЕЦЦА ГЛЯДЗЕЦЬ ВОСЬ НА **ГЭТА**, Я БЕЗУМОЎНА ВАНІТЫ НЕ СТРЫМАЮ.
АДНЫ, СУКА, РЭДАКТАРЫ НАВАКОЛ.
POTI
KISS HERE




...СУЦЬ У ТЫМ, ШТО Ў НАШЫМ АРСЕНАЛЕ ТОЛЬКІ ВОЧЫ І ГАЛАВА.
ВАЖНА НЯ ПРОСТА ЎБАЧЫЦЬ СВАІМІ ВАЧАМІ, АЛЕ ЯШЧЭ І ДАКЛАДНА РАСТЛУМАЧЫЦЬ ТОЕ, ШТО ЎБАЧЫЎ.
ВЫЯЎЛЕННЕ ЯК СПОСАБ ЖЫЦЦЯ.
У САМЫ РАЗ. ТАКАЯ ВОСЬ ПРАЦА – РАСПОРВАЕМ ЧЭРАВА СВЕТУ І ЎНЮХВАЕМСЯ Ў ВАНТРОБЫ.
POTI
Burger
Monkey
Burger
У ВУЛФІТА, У ШКОЛЕ ЖУРНАЛІСТАЎ, ГЭТА ПАДАЕЦЦА ТРОХІ НЯ ТАК...
ДА ЛІХАМАТАРЫ ВУЛФІТА. КАЛІСЬЦІ МЫ РАЗАМ ПРАЦАВАЛІ НА «ДЭЙФАКС», ЯШЧЭ КАЛІ ГЭТА БЫЛА **ВАРТАЯ** ГАЗЕТА.
ЁН ТАМ У СВАІМ «СТАРАМОДНЫМ АГЛЯДЗЕ» **КВЕТКАВЫЯ ВЫСТАЎКІ** АСВЯТЛЯЎ, КАБ ІХ. ЯК ТОЛЬКІ Ў ЯГО ЯЕК ХАПІЛА ШКОЛУ ЖУРНАЛІСТЫКІ ЗАСНАВАЦЬ...
І ЎВОГУЛЕ, ЖУРНАЛІСТАМ СТАНОВІШСЯ, НЕ ПА ШКОЛАХ ЖУРНАЛІСТЫКІ БОЎТАЮЧЫСЯ, А **АКУНУЎШЫСЯ Ў ЖУРНАЛІСТЫКУ З БАШКОЙ**.
РАЗУМЕЕШ, ГЭТА ЯК СПЛАВІЦЬ МАЗГІ, ВАНТРОБЫ І ДЗЕТАРОДНЫЯ ОРГАНЫ Ў АДЗІНУЮ МАШЫНУ, ЯКАЯ НАВОДЗІЦЬ ЖАХ, У ГАРМАТУ З МЯСА, НАЦЭЛЕНУЮ НА ПЛАНЕТУ...
ГАРМАТА З МЯСА? А З МЯНЕ, ШТО АТРЫМАЕЦЦА? ДРАПЕЖНАЯ ВАГІНА?


А ХОЦЬ І ТАК. ВОСЬ, ТРЫМАЙ...
...ВЯСЁЛЕНЬКІ ЗНАЧОК. НУ ХІБА Я НЯ ДОБРЫ ДА СВАЙГО АСІСТЭНТА?
ЭМБЛЕМА ТРАНСІЯНЦКАГА РУХУ. ПАСЛУЖЫЦЬ ТАБЕ ЎСПАМІНАМ.
ПРА ШТО?
УСЕ ЛЮДЗІ – ПАСКУДЗЬ, ЯК БЫ ЯНЫ НЕ ВЫГЛЯДАЛІ. ДЫК ШТО, ЎПІСВАЕШСЯ, ЗНАЧЫЦЬ?
РОЙС СКАЗАЎ, ТАК ТРЭБА. А СВОЙ ВУЧЭБНЫ КУРС Я МАГУ СЛУХАЦЬ ПРАЗ ТУТЭЙШУЮ СЕТКУ.
MONKEY
BURGER
ХМ. Я НЕ АСАБЛІВА ПРЫВЫК ДА КАМПАНІІ ЎВОГУЛЕ, АЛЕ **ПАСПРАБАВАЦЬ,** БАДАЙ, МОГ БЫ...
ДАРЭЧЫ, ТРЭБА ГЛЯНУЦЬ SPFK, МНЕ ЯШЧЭ НАД СЛУПКОМ ГАРБЕЦЬ.
ГАСЦЕЙ ВАДЗІЦЬ МОЖНА? У МЯНЕ ХЛОПЕЦ...
НАПРАМІЛЫ БОГ, ТОЛЬКІ СПАЧАТКУ ЗАКАЖЫ ДЛЯ ЗБІРАЛЬНІКА ГУКАЎПАРТУЮ КАПСУЛУ.
УВОГУЛЕ, КАБ НІЯКАГА ШУМУ.
ШТО, БАІШСЯ, ШТО **НОЧЧУ** ВЕЛЬМІ **ШУМЕЦЬ** БУДЗЕМ?



А ШТО ТАКОЕ?...
Я НЯ КЛОСЬЦІЎСЯ ЎЖО **ЧАТЫРЫ ГАДЫ**, ВОСЬ «**ШТО ТАКОЕ**»! А ЦЯПЕР І СПРАБАВАЦЬ ЎЖО БАЮСЯ!
У МЯНЕ ТАКІ ЦІСК САБРАЎСЯ, ШТО Я ЛЁГКА ПРАБІЎ БЫ Ў ЖАНЧЫНЕ ДЗІРКУ ПАМЕРАМ З МОЙ КУЛАК!
ВОСЬ РАЗГАВАРЫЎСЯ.
А ЗАТОЕ ЎЯВІ, ЯКІ Б ВЫЙШАЎ СЛУПОК. «ЖАНЧЫНА ЗАСТРЭЛЕНА З РАКЕТНІЦЫ. ЭКСПЕРТЫ-БАЛІСТЫКІ Ў ЗАМЯШАННІ».
ТАК ЦІ ІНАКШ, РАБІ ТОЕ, ШТО ТАБЕ **КАЖУЦЬ**. КАБ Я НЯ ЧУЎ, ЯК У ГЭТАЙ КВАТЭРЫ ХОЦЬ **ХТО-НЕБУДЗЬ ЗАБАЎЛЯЕЦЦА**. ГЭТА ЗРАЗУМЕЛА?
ТАК'ТОЧН 'СЭР.
ВОСЬ І ДАБРА. ПАБАЧЫМ, ШТО ТУТ У НАС...
SPKF
CFC АНАНСУЕ ТУР У ПАДТРЫМКУ АЛЬБОМА «АТРУЧАНЫ ДОЖДЖ». ШТОСЬЦІ ДОБРАЕ?
ДЫ ЗВЫЧАЙНАЯ ПОСТРЭКАНСТРУКТЫВІСЦКАЯ ЛУХТА. НАКШТАЛТ «ВОСЬ, ДЗЕСЬЦІ, ЛЯЖЫЦЬ ТУША ЗАБІТАГА ЗВЕРА, А КАХАНАЯ КІНУЛА МЯНЕ, КАЛІ Я СТАЎ ІМПАТЭНТАМ, ЗДАЎЛЕНЫМ ЦЯЖАРАМ СВЕТУ». НУ І ТРУ-ЛЯ-ЛЯ, І ГЭТАК ДАЛЕЙ.





SPKF
HOT
MENU
ЯНЫ, ЯК ПАЧАЛІ НАСІЦЬ АНТЫТРАЎМАТЫЧНЫЯ ГАРСЭТЫ, ТАК І ПЕРАСТАЛІ ПАДАБАЦЦА. І ВОСЬ УЖО ШЭСЦЬ ГАДОЎ Я ІХ НЯ СЛУХАЮ.
А ДЫНГА-БЭБІ ЛЕКЛЕРКА ЧУЛА КАЛІ-НЕБУДЗЬ? ВОСЬ МІЗЭРАБІЛІЗМ БЫЎ, ГЭТА ТАК.
ТАТА ПРА ЯГО РАСКАЗВАЎ...
ЁН ЖА ПЯТНАДЦАЦЬ ГАДОЎ ТАМУ ЗНІК КУДЫСЬЦІ?
...А БОЖУХНА... НІКОЛІ НЕ НАГАДВАЙ, ЯКІ Я СТАРЫ.
БУЙ ТАМ ПЛАВАЎ – ЗНІК. УПЯКЛІ ЯГО ЗА ТОЕ, ШТО ЎРЫВАЎСЯ ЁН У ДАМЫ САСТАРЭЛЫХ І ПРАВОДЗІЎ ТАМ НАД ІХ ПРАБЫВАЛЬНІКАМІ ЭКЗАРЦЫСКІЯ РЫТУАЛЫ.
А **КУР'ЁЗ** У ТЫМ, ШТО, ПА МАІХ ЗВЕСТКАХ, ТАКІЯ ПАВОДЗІНЫ ЯМУ **РЭКАМЕНДАВАЎ** ПСІХІЯТР У ЯКАСЦІ АЛЬТЭРНАТЫВЫ РАСКОПВАННЮ МАГІЛ І НЕКРАФІЛІІ.
ГЭЙ.
ПРЭЗІДЭНТ У ГОРАДЗЕ.
ВЯРТАЕМСЯ ДА РАЗМОВЫ ПРА ТАГО, ХТО І ТРУП РОДНАЙ БАБКІ АДКЛОСЬЦІЎ БЫ...





...ДЗЕЛЯ ПЕРАМОГІ НА ВЫБАРАХ.
ПЕРАДВЫБАРЧАЯ БАЛБАТНЯ Ў ЯГО; ПЕРШУЮ АФІЦЫЙНУЮ ПРАМОВУ ЁН ШТУРХАЕ ТУТ, У АРКАДЫН-ХОЛЕ.
ПОЙДЗЕМ, НАВЕДАЕМ ПРЭЗІДЭНТА.
ЗАРАЗ?
ЗАРАЗ ЖА, КАБ ЯГО. ШТО НЯ ТАК?
НУ, МЫ НЕ ПРАВЯЛІ ПАДРЫХТОЎКУ, НЕ ПАДРЫХТАВАЛІ ПЫТАННІ, У НАС НЯМА ПЛАНА І НАМ НЕ НАЗНАЧАНА...
ШЭНАН, ГЭТЫ ЛАЙНЮК РОЙС ПРЫСЛАЎ ЦЯБЕ ПА-ПЕРШАЕ ПІЛЬНАВАЦЬ МЯНЕ, ПА-ДРУГОЕ ВЫВУЧЫЦЬ ЖУРНАЛІСТЫКУ. ТАК?
ТАК. І ШТО?
А ТОЕ. ЖУРНАЛІСТЫКА – ГЭТА ТАБЕ НЯ ПЛАНЫ І НЯ СРАТЫЯ ЗАПІСУЛЬКІ. ГЭТА ЖЫВАЯ РЭАКЦЫЯ І СУПРАЦЬЗАКОННЫЯ ДЗЕЯННІ. УРОК ПАЧЫНАЕЦЦА.
І КАЛІ Я ПАВІНЕН БЫЦЬ ПАД НАГЛЯДАМ У СТРЫПТЫЗЁРКІ, ТО ДАВАЙ, ВАРУШЫ БУЛКАМІ.
БЫЛОЙ СТРЫПТЫЗЁРКІ. А ЯШЧЭ Я АДЗІН МЕСЯЦ БЫЛА ГРАБЕЖНІЦАЙ І ТРЫ ЦЕЛААХОЎНІЦАЙ.
AIR LIFT
ЯШЧЭ ЛЕПЕЙ. ЗА ТАКСІ ЗАПЛАЦІШ?


АРКАДЫН-ХОЛ.
ШТО РОБІШ?
ЗАГРУЖАЮ З «НАРЫ» СВЕЖУЮ ГАЗЕТНУЮ ПАДБОРКУ МАТЭРЫЯЛАЎ ПРА ПРЭЗІДЭНТА.
SKY CAM



АДКУЛЬ-АДКУЛЬ?
САЙТ АГЕНЦТВА НАВІН З ЛУГ-БЭНДА Ў ВЭСТ-САЙДЗЕ. ТАМ РОБЯЦЬ ПАДБОРКІ І АРХІВЫ НАВІН, БЯЗ ГЭТАЙ, ВЕДАЕШ, СТАРОННАСЦІ ЦЭНТРАЛЬНЫХ КАНАЛАЎ.
БАЦЬКА КУПІЎ МНЕ АКАУНТ НА ТРЫ ГАДЫ, АЛЕ Я ІМ АМАЛЬ НЕ КАРЫСТАЛАСЯ. ВЕЛЬМІ СУМНА, АДЗІН ТЭКСТ. МНЕ «AMFEED» БОЛЬШ ПАДАБАЕЦЦА.
ЧАСАМ ТРОШКІ СУМУ ГЭТАМУ ГОРАДУ НЕ ПЕРАШКОДЗІЛА Б. НУ-С, Я НЕ ЗУСІМ У КУРСЕ АПОШНІХ ПАДЗЕЙ. ШТО ТАМ, У ТВАЁЙ ПАДБОРЦЫ?
FRIED MICE



ВОСЬ, ВЫБАРЧЫ ФОНД ВЫЧАРПАНЫ. ВЯРХОЎНЫ СУД УЛЯПІЎ ЯМУ САМАВІТАЕ СПАГНАННЕ ПА ВІНАВАЧАННІ Ў НАНЯСЕННІ МАРАЛЬНЫХ І ФІЗІЧНЫХ КАЛЕЦТВАЎ...
...І СТАРЫ ВЫБЛЯДАК АДСЫПАЎ ІМ СА СВАЙГО СТРАТЭГІЧНАГА ЗАПАСУ? КАБ МЯНЕ. ЁН-ТАКІ ДАМОГСЯ ДЛЯ СЯБЕ ПРАВА КРУЦІЦЬ АХВЯРАВАННЯМІ, ЯК АСАБІСТЫМІ ПАДАЧКАМІ, ТАК? ЗАГРАБАСТАЎ ГРОШЫКІ...
ЁН ДАЎНО ПАДБІРАЎСЯ ДА ГЭТАГА ФОНДУ, АЛЕ Я І ПАДУМАЦЬ НЯ МОГ, ШТО Ў ЯГО АТРЫМАЕЦЦА ЎЛАДЗІЦЬ ГЭТУ СПРАВУ.
НЕ АТРЫМАЕЦЦА. ТРЭЦЯГА ТЭМІНУ ЯМУ ЎСЁ РОЎНА НЯ БАЧЫЦЬ. **УСМЕШЛІВЫ** ТАГО І ГЛЯДЗІ ПРЫШЧЫКНЕ ЯМУ ХВОСТ.
ГЭТЫ СЛАБАК? РАЗМРОІЛАСЯ. ДАВАЙ **ДАЛЕЙ**.
СЁННЯ ЁН МАЕ НАМЕР ГАЛОЎНЫМ ЧЫНАМ КАНЬКАЦЬ У БІЗНЕСМЭНАЎ. У ЯГО НАВАТ НА ЭСКОРТ ЦЕЛААХОЎНІКАЎ ГРОШАЙ НЯМА.
А САКРЭТНАЯ СЛУЖБА НАВОШТА?
ЦЯПЕР СС-АЎЦЫ **ПАТРАБУЮЦЬ**, КАБ ЗА СУПРАВАДЖЭННЕ ПРЭЗІДЭНТ **ПРЫПЛАЧВАЎ** ІМ **СА СВАІХ ГРОШАЙ**. ВЕДАЕШ, КОЛЬКІ РАЗОЎ ЗА ГЭТЫ ГОД НА ЯГО РАБІЛІ ЗАМАХ?
МАЛА РАБІЛІ ЗАМАХАЎ.
НУ ВОСЬ... У ІХ АХОЎНІК НА ЎВАХОДЗЕ...
АХОЎНІК **АРКАДЫН-ХОЛА**. НЕ **ПРЭЗІДЭНЦКІ**. **ПАДЫГРАЙ** МНЕ.


ВЯЛЕБНЫ ПАЛКОЎНІК ДЖЭЙКАБ КАПОНЭ, СТАРШЫНЯ ЗАХОДНЯГА АДДЗЯЛЕННЯ ВАЕНІЗАВАНАГА КОРПУСА НАЙМІТАЎ ІЕГОВЫ. ГЭТА ФІФА – МАЯ ПАСЛУШНІЦА.
ХАЦЕЛАСЯ Б ТРАПІЦЬ НА ПРЭЗІДЭНЦКУЮ ПРАМОВУ.
ХМ. ГЭТАГА ДАКУМЕНТА НЕДАСТАТКОВА.
ЯК ВАМ ГЭТЫ?
FRIENDS OF THE PRESIDENT
ПРАШУ, УВАХОДЗЬЦЕ, СЭР, ПАСЛУШНІЦА. ПРАМОВА БУДЗЕ Ў БУЛГАКАЎСКАЙ ЗАЛЕ, ВАМ ПРАМА І ЗА ПУБЛІЧНЫМ ЗБІРАЛЬНІКАМ – НАЛЕВА.
ДЗЯКУЮ.
ФІФА?
ДАЛЕЙ ШТО?
У НАСТУПНЫ РАЗ ТУПА ЛЫБСЯ І ПАЖЫВІСЯ ЯКОЙ-НЕБУДЗЬ ЛІПАВАЙ КСІВАЙ, БЕЗ ЯЕ – НІКУДЫ.



ЗНАЧЫЦЬ, ЗАРАЗ СЛУХАЕМ ЗВЯРТАННЕ. ЗАПІСВАЕМ ЗА ІМ УСЮ ХЛУСНЮ. ГЭТАГА ДАБРА НАВАЛАМ БУДЗЕ, ТАКІМ ЧЫНАМ ВЫЗВАЛЯЙ ПАМЯЦЬ У СВАІМ НАДАЛОННІКУ.
ПОТЫМ – ДАДОМУ, І ПІШАМ ТАКІ СЛУПОК, КАБ З ЯГО КРЫВАВЫЯ СЛЁЗЫ ПЫРСНУЛІ І СФІНКТАР АДМОВІЎ.
ЯКСЬЦІ ТЫ **ЗАЦЫКЛЕНЫ** НА АПАРАЖНЕННІ КІШЭЧНІКА.
ГЭТА ТОЛЬКІ СЁННЯ ТАК. Я СКОНЧЫЎ СА СТЫМУЛЯТАРАМІ І ЗАРАЗ РАССЛАБЛЕНЫ, ЯК ШЧЫЛІНКА Ў КАТАЛІЧКІ.
A ВОСЬ І ПРЫБІРАЛЬНЯ. ЧАКАЙ ТУТ, КАЛІ ХТО ПАДЫДЗЕ, ЛЫБСЯ І ДАЙ ЗРАЗУМЕЦЬ, ШТО Ў ЦЯБЕ АДСУТНІЧАЕ МОЎНЫ ЦЭНТР.
ЯК СКАЖАШ.
ВЕЛЬМІ ДОБРА.
ПРЫЯЦЕЛЬ, ТУДЫ НЕЛЬГА.
ГЭТА Ж ЯКОГА ЛЯСУНА? ЗЛАМАНА ЦІ ШТО?
ПРЫЯЦЕЛЬ, ТУДЫ **САПРАЎДЫ** НЕЛЬГА.
СЛУХАЙЦЕ ВЫ, ПАЦУЧЫНАЯ ССАНІНА, Я ЎПАЎНАВАЖАНЫ **ЭКЗАРЦЫСТ ГАРАДСКОЙ УЛАДЫ**, І ДЗЕ МНЕ, БЛЯ, **ЗАМАНЕЦЦА**, ТАМ Я І **ПРАЙДУ**...
ДОБРА, ЧАГО ЎЖО ТАМ.
ДЗЯКУЙ. **ГОСПАДЗІ**...



УХХХ...
ААХХРР...
ТАННЫЯ АЎСТРАЛІЙСКІЯ САМАДАЙКІ, КАБ ІХ ЧОРТ УЗЯЎ...
ЕРУСАЛІМ.
СПАДАР ПРЭЗІДЭНТ.


А Я ТОЛЬКІ ШТО ПРА ВАС КАЗАЎ. УЯЎЛЯЮ ВАС ЯКРАЗ У ТАКІМ СТАНОВІШЧЫ.
Я ТАК РАЗУМЕЮ, МНЕ НЕ ХЛУСІЛІ ПРА ВАШЫЯ АДНОСІНЫ З САКРЭТНАЙ СЛУЖБАЙ, М-М?
НЕ ПУЖАЙЦЕСЯ. ГЭТА ТОЛЬКІ ГУКАНЕЎПАРТАЯ КАПСУЛА. ЛІЧУ, ШТО МЫ МОЖАМ НЕНАДОЎГА АДАСОБІЦЦА.
МНЕ ПРЫЕМНА, ШТО ВЫ ПАМЯТАЕЦЕ МАЁ ІМЯ.
НЯ РУМЗАЙ. ПА ЗАСЛУГАХ ТАБЕ КОЖНАЕ МАРКІТАВАНАЕ СЛОЎЦА.
О, КАБ Я НЯ ПАМЯТАВАЎ ТВАЁ ІМЯ, ВАРКІЛА? Я ПАМЯТАЮ ЎСЁ, ШТО ТЫ ПРА МЯНЕ ПАНАПІСВАЎ.
ГЭТА З-ЗА **ЦЯБЕ** МЯНЕ **НАЗЫВАЮЦЬ** ЗВЕРАМ. УСЕ **ДА АДЗІНАГА**. ПРЭСА, ПАДНАЧАЛЕНЫЯ, МАЕ ДЗЕЦІ...
ТЫ ССАЎ НА ЭКАНОМІКУ, СРАЎ НА ЗАКОН І ПАДЦІРАЎСЯ ІСЦІНАЙ.
ШКУРУ Б З ЦЯБЕ СПУСЦІЦЬ ДЫ СОЛЛЮ ПРЫСЫПАЦЬ, ДЫ КАБ ЦЯБЕ ЗГРАЯ ПСІХАЎ З ДУБІНКАМІ ПА ВУЛІЦАХ ПАГАНЯЛА, ДЫ ПОТЫМ УСТРОІЦЬ НА ТАБЕ ПАРАШУ І СПЕРМАЗБІРАЛЬНІК ДЛЯ ПАВІЯНАЎ У ГОНЕ.
І ГЭТАГА МАЛА.


Я ЧУЎ, ШТО ТЫ ЗЛІНЯЎ З ГОРАДА, ТАМУ ШТО НЕРВЫ ЗДАЛІ.
Я ПАКІНУЎ ГЭТЫ ГОРАД, КАЛІ ТЫ ПЕРАКРОІЎ ПА СВАІМ ПАДАБЕНСТВЕ І ВЫВЕ І ЯГО, І ЎСЮ КРАІНУ.
ЛУХТА САБАЧАЯ. ТЫ БАІШСЯ САПРАЎДНАЙ АМЕРЫКІ. І ЎСЕ ВЫ ТАКІЯ, ЧУЛЛІВЫЯ НЫЦІКІ.
НЯМА «САПРАЎДНАЙ АМЕРЫКІ», ВЫБЛЯДАК! НЯМА САПРАЎДНАГА ГОРАДА!
ГОРАД ТАКІ, ЯКІМ ЯГО **РОБІМ МЫ**! А ТЫ ІРВЕШСЯ ПЕРАТВАРЫЦЬ ЯГО Ў ГІГАНЦКУЮ **ЯЗВУ**, ЯКАЯ БУДЗЕ САЧЫЦЦА **ГРАШАМІ**, ЯК **ГНОЕМ**!
ТЫ, ЕРУСАЛІМ, ЗАНУДА І ШЫЗІК.
ПАНАВЫДУМЛЯЎ НЕЙКАЙ ЖУДАСЦІ ПРА «ЗНЕВАЖЭННЕ ЛЮДКАСЦІ», ЯКОЕ, НІБЫ, РУШЫЦЬ ПАСЛЯ МАЙГО АБРАННЯ...
ДЫ КАМУ ЯНА **ПАТРЭБНА**? ЛЮБКАСЦЮ **СЫТЫМ** НЯ БУДЗЕШ, НЯ ХОДКІ **ТАВАР**.
ГОРАД ЗАБЯСПЕЧЫЎ МНЕ **АБСАЛЮТНУЮ** ПЕРАМОГУ, А ВЕДАЕШ **ЧАМУ**?
А ТАМУ ШТО ЯМУ НІЧОГА НЕ ПАТРЭБНА, АКРАМЯ ДАГОДЛІВАГА ТЭЛЕБАЧАННЯ, ЗАНАЧКІ НА П'ЯНКУ І МІНЕТУ Ў СУБОТУ ЎВЕЧАРЫ.


МАБЫЦЬ ТЫ І МАЕШ РАЦЫЮ. МАБЫЦЬ.
ДЫ ТОЛЬКІ ПЛЯВАЎ Я НА ГЭТА.
ВОХ ТЫ, ЖУРНАЛЮГА ПЛЯВАЎ, ПАБАЧЦЕ...
У ЦЯБЕ – ТВАЯ ЛЮДАЕДСКАЯ ПАЛІТЫКА, А У МЯНЕ – СЛУПОК.
І НЯ ВЕДАЦЬ МНЕ СУПАКОЮ, ПАКУЛЬ ТВАЮ АДПЯРДОЛЕНУЮ, ПАДСМАЖАНУЮ, ВЫЛЕГЧАНУЮ І САБАЧЫМ ЛАЙНОМ НАБІТУЮ ТУШУ НЕ ЗАДЗЯРУЦЬ ПАСЯРОД СЭНЧУРЫ-СКВЕР НА ЗАБАВУ НЕКРАФІЛАМ.
ЧАС МНЕ ІСЦІ, АЛЕ ПЕРАД ГЭТЫМ...
...ЖАДАЮ ТАБЕ ШТОСЬЦІ ПАКАЗАЦЬ.


ГЭТА **КІШКАРАЗ-ДЗІРАЦЕЛЬ**. АПАЗНАВАЛЬНЫХ ПРЫКМЕТ НЯ МАЕ. ЯГО ЎПЛЫЎ НА АРГАНІЗМ НЕМАГЧЫМА ЗАФІКСАВАЦЬ.
У ЯГО ЁСЦЬ РОЗНЫЯ РЭЖЫМЫ. ВОСЬ ТУТ ШКАЛА, БАЧЫШ?
БУРЛІВЫ...
ВАДКІ...
УРАГАННЫ.
LOOSE
ТАМ ЧАЛАВЕК УНУТРЫ, З ІМ НАКШТАЛТ ЯК НЕПРЫЕМНАСЦЬ ЗДАРЫЛАСЯ. ВЫ НЕ З АХОВЫ АРКАДЫНХОЛА, Я ЎСЁ РАЗУМЕЮ, АЛЕ...


ТРЭБА СЫХО-ДЗІЦЬ, ХУТКА.
ШТО? А ЯК ЖА ПРАМОВА? З ТВАЁЙ ДУПАЙ ШТОСЬЦІ НЯ ТАК?
ПАТРЭБНА ДАПА-МОГА! ПРЭЗІДЭНТ АБГАДЗІЎСЯ!
ТРЭБА СЫХО-ДЗІЦЬ, ХУТКА.
ПРА-ВІЛЬНА.
ВОСЬ ТАК, ШЭНАН. ЖУРНАЛІСЦКІ ДОЛГ АБА-ВЯЗВАЕ НАС УСЯЛЯЦЬ ЖАХ У СЭРЦЫ ЗЛАЧЫНЦАЎ.
ГЭТА ТВАЁЙ ПУШКАЙ З МЯСА?
ЦІ ТВАЁЙ ДРАПЕЖНАЙ ВАГІНАЙ.
ЦІ ТВАІМ НЕЛЕГАЛЬ-НЫМ КІШКАРАЗ-ДЗІРАЦЕЛЕМ.
ДЫ ХОЦЬ ЧЫМ...